# Рэкамендацыі па выніках вывучэння чытання і разумення тэксту (чытацкай адукаванасці) на беларускай мове вучняў IV класаў

Вывучэнне чытацкай адукаванасці вучняў IV класаў праводзілася ў 2023 годзе ў адпаведнасці з загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.07.2022 г. № 476 «Аб правядзенні маніторынгу (вывучэнні) якасці агульнай сярэдняй адукацыі ў 2022/2023 навучальным годзе».

У даследаванні прынялі ўдзел 5162 вучні IV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (далей — установы адукацыі): 4 428 (85,8 % ад агульнай колькасці) вучняў гарадскіх устаноў адукацыі і 734 (14,2 %) сельскіх устаноў адукацыі. Дыягнастычную работу выконвалі 2 587 дзяўчынак (50,1 % ад агульнай колькасці ўдзельнікаў) і 2575 хлопчыкаў (49,9 %).

З мэтай выяўлення фактараў, якія маглі істотна паўплываць на вынікі даследавання, праводзілася анкетаванне педагагічных работнікаў, вучняў і іх законных прадстаўнікоў.

## ДЫЯГНАСТЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТАРЫЙ

Дыягнастычны інструментарый для вымярэння чытацкай адукаванасці ў чацвёртакласнікаў быў прадстаўлены пісьмовымі дыягнастычнымі матэрыяламі, кожны з якіх утрымліваў 2 тэксты і 10 заданняў, распрацаваных з улікам крытэрыяў міжнародных даследаванняў якасці чытання і разумення тэксту PIRLS і ацэнкі адукацыйных дасягненняў вучняў PISA.

На выкананне тэстаў адводзілася 80 хвілін (дзве часткі па 40 хвілін з перапынкам). Вучні запісвалі адказы на бланку.

Тэставыя заданні былі прадстаўлены ў двух варыянтах, якія ўключалі несуцэльныя тэксты (мастацкі і прыродазнаўчанавуковы), скампанаваныя з тэкстаў і фотаздымкаў. Выкарыстанне несуцэльных тэкстаў абумоўлена неабходнасцю дыягнаставаць, як вучні ўспрымаюць і ўсведамляюць адзінкі інфармацыі, прадстаўленыя ў вербальнай і невербальнай форме.

Істотным патрабаваннем да падбору тэкстаў была сувязь матэрыялу з беларускімі рэаліямі, наяўнасць у іх выхаваўчага патэнцыялу.

У I варыянт увайшлі тэксты «Сакаляняты» і «Андатра — беларуская амерыканка».

У апавяданні «Сакаляняты» падаецца прыклад адказнага стаўлення людзей да прыроды. Вучням прапаноўвалася ўсвядоміць асаблівасці ўзаемадзеяння людзей у грамадстве і іх узаемадачынення са светам прыроды, інтэрпрэтаваць матывацыю ўчынкаў герояў, вызначыць прычыны і парадак падзей у творы, зрабіць вывады.

Ва ўрыўку прыродазнаўчанавуковага характару «Андатра — беларуская амерыканка» распавядаецца пра вандроўку героя на Нарачанскія азёры і назіранне за андатрамі — грызунамі, завезенымі з Амерыкі ў Беларусь у мінулым стагоддзі. Задача, з якой быў прапанаваны тэкст, — ацаніць здольнасць выяўлення вучнямі факталагічнага зместу, уменне канструяваць зрокавыя вобразы на аснове прачытанага, супастаўляць іх з прапанаванымі візуальнымі стымуламі, суаднасіць атрыманыя звесткі з жыццёвымі рэаліямі.

У II варыянт задання ўвайшлі тэксты «Таямнічая прапажа» і «Лён — дзіва-кветка».

У апавяданні «Таямнічая прапажа» дзеянне адбываецца ў знаёмым і зразумелым вучням школьным асяроддзі, у якім героі вырашаюць этычную праблему. Паколькі твор мае празрыстую структуру і ў ім увасоблены яркія дзіцячыя вобразы, вучні маглі цэласна ўспрымаць сюжэт, назіраць за разгортваннем падзей і ўчынкамі герояў, ацэньваць іх паводзіны, прагназаваць эмацыянальную рэакцыю герояў твора, рабіць вывады на аснове прачытанага.

Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Лён — дзіва-кветка» насычаны фактамі пра названую расліну, што падаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці ад старажытнасці да нашых дзён. Вучням пры чытанні неабходна было выкарыстаць уменні аналізаваць розныя па сэнсу блокі тэксту, успрымаць гістарычную інфармацыю, прасочваць этапы вырабу льнянога тэкстылю, разумець спосабы практычнага выкарыстання вырабаў са льну.

Мастацкія тэксты мелі выразную праблематыку, сюжэтную лінію і ўтрымлівалі звесткі пра невялікую колькасць персанажаў, што давала магчымасць дакладна разумець сэнс, вызначаць парадак падзей, ацэньваць аўтарскую задуму, правільна інтэрпрэтаваць інфармацыю. Адэкватнаму ўспрыманню зместу ў працэсе чытання спрыялі фотаілюстрацыі.

Прыродазнаўчанавуковыя тэксты былі адаптаваны і скарочаны ў адпаведнасці з узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі вучняў. Фактычная інфармацыя ў іх пададзена дазіравана, звесткі прадстаўлены нелінейна і ў рознай форме (напрыклад, лікавыя — у вербальнай, а некаторыя істотныя для разумення зместу — у невербальнай).

У даследаванні ацэньваліся наступныя групы ўменняў:

I — знаходзіць і здабываць інфармацыю;

II — інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю;

III — асэнсоўваць і ацэньваць змест і форму тэксту;

IV — выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту.

Першыя дзве групы ўменняў былі звязаны непасрэдна з тэкстам, які чытаецца. Астатнія патрабавалі пазатэкставых ведаў і ўмення аперыраваць імі.

Групы чытацкіх уменняў вылучаліся найперш паводле характару аперацый мыслення, камбінацыі і парадку разумовых дзеянняў, якія патрабаваліся ад вучня і не былі звязаны з узроўнем складанасці заданняў, колькасцю балаў за яго выкананне. Так, заданні першай групы мелі сярэдні і высокі ўзровень складанасці, калі інфармацыя, прызначаная для пошуку, давалася чытачам праз сінанімічныя лексічныя адзінкі або ўтрымлівалася ў розных фрагментах тэксту. Заданні чацвёртай групы мелі нізкі ўзровень складанасці; выкарыстанне інфармацыі з тэксту патрабавала простых разумовых дзеянняў і наяўнасці элементарных бытавых уяўленняў.

Паводле фармату адказу былі прапанаваны заданні з выбарам аднаго правільнага варыянту адказу, з выбарам некалькіх правільных варыянтаў, з выбарам адказу і тлумачэннем, з кароткім адказам, а таксама заданні на ўстанаўленне адпаведнасці і парадку падзей.

Агульная колькасць балаў, якую можна было атрымаць за тэст, склала 100 балаў. За выкананне аднаго задання вучні маглі атрымаць ад 0 да 15 балаў у залежнасці ад структуры, узроўню яго складанасці, фармату адказу і спецыфікі ўменняў, якія правяраюцца.

Шкала ацэнкі сфарміраванасці чытацкіх уменняў вучняў была наступнай: нізкі ўзровень сфарміраванасці чытацкіх уменняў: 1—20 балаў за тэст, здавальняючы ўзровень: 21—40 балаў, сярэдні: 41—80 балаў, высокі ўзровень сфарміраванасці чытацкіх уменняў: 81—100 балаў.

## Вынікі вывучэння сфарміраванасці чытацкай адукаванасці ў вучняў IV класаў

Сярэднія балы за тэставую работу, атрыманыя вучнямі розных катэгорый, вылічваліся паводле суцэльнай выбаркі і прадстаўлены ў дыяграме.

Сярэдні бал за тэст, які выконваўся вучнямі на аснове мастацкага тэксту, склаў 75,0 балаў; на аснове прыродазнаўчанавуковага тэксту — 74,0 балы.

Дзяўчынкі справіліся з заданнямі лепш за хлопчыкаў: сярэдні бал за выкананне заданняў да мастацкага тэксту ў дзяўчынак склаў 76,3 балы, у хлопчыкаў — 73,0 балы, за выкананне заданняў да прыродазнаўчанавуковага тэксту — 74,4 і 72,8 балы адпаведна. Розніца ў выніках з'яўляецца статыстычна нязначнай.

Вучні ўстаноў адукацыі, што размешчаны ў сельскай мясцовасці (сельскія ўстановы адукацыі), больш паспяхова справіліся з тэстам на аснове беларускамоўнага мастацкага матэрыялу ў параўнанні з вучнямі ўстаноў адукацыі, размешчаных у гарадской мясцовасці (гарадскія ўстановы адукацыі). Паказчыкі сярэдняга бала складаюць 75,7 і 74,4 адпаведна. Вучні сельскіх устаноў адукацыі паказалі лепшыя вынікі і пры выкананні заданняў да прыродазнаўчанавуковага тэксту. Паказчыкі сярэдняга бала складаюць 75,0 і 73,3 адпаведна. Розніца ў выніках з'яўляецца статыстычна нязначнай.




**Дыяграма — Сярэднія балы, атрыманыя за тэст рознымі катэгорыямі вучняў**

## РАЗМЕРКАВАННЕ ВУЧНЯЎ IV КЛАСАЎ ПА ЎЗРОЎНЯХ СФАРМІРАВАНАСЦІ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ

Даследаванне паказала, што колькасць чацвёртакласнікаў з сярэднім і высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў складае 92,0 % (пры выкананні заданняў да мастацкага тэксту гэты паказчык склаў 93,1 %, прыродазнаўчанавуковага — 90,9 %).

Істотнай розніцы ў авалоданні навыкамі чытання і разумення тэксту з пункту гледжання полавай прыналежнасці не заўважаецца: сярэдні і высокі ўзровень авалодання навыкамі чытання і разумення мастацкага тэксту паказалі 89,9 % хлопчыкаў і 94,5 % дзяўчынак, сярэдні і высокі ўзровень авалодання навыкамі чытання і разумення прыродазнаўчанавуковага тэксту — 90,3 % хлопчыкаў і 91,5 % дзяўчынак.

### Уменне знаходзіць і здабываць інфармацыю

Да адзначанай групы чытацкіх уменняў адносяцца наступныя: вызначаць месца, дзе ўтрымліваецца інфармацыя, якая падлягае пошуку (фрагмент тэксту, загаловак, спасылка на крыніцу або аўтара); знаходзіць адну альбо некалькі адзінак інфармацыі, размешчаных у адным фрагменце тэксту ці розных яго фрагментах; знаходзіць некалькі адзінак інфармацыі, размешчаных у розных тэкстах; вызначаць наяўнасць або адсутнасць пэўнай інфармацыі ў канкрэтным тэксце.

Заданні гэтай групы чытацкіх уменняў складаныя тым, што варыянты адказу на пытанні прадстаўляюцца ў выглядзе сінанімічнай замены, калі паміж пытаннем і той адзінкай, якую трэба знайсці, няма відавочнай адпаведнасці (ключавых, падобных, аднакаранёвых слоў) — ёсць толькі агульны сэнс. Таксама складаны для чацвёртакласнікаў быў выбар адказу на пытанне пры залішняй колькасці інфармацыі.

Прывядзём прыклад задання, якое выклікала цяжкасці ў вучняў, і прааналізуем іх магчымыя прычыны.

*Прыклад 1*

**Мастацкі тэкст «Сакаляняты»**

***Заданне.*** Якія словы найлепш апісваюць дзеянні герояў твора? Выберыце дзеянне і насупраць яго ў адпаведнай ячэйцы пастаўце знак «✓» (галачка).

Вучням неабходна было не толькі перачытаць твор, утрымліваючы ў памяці некалькі персанажаў, але і прадставіць адказ у нязвыклай форме — суаднесці героя тэксту з яго дзеяннямі і паставіць адпаведны знак у табліцы. Нягледзячы на тое, што для выканання задання дастаткова было знайсці ў творы адпаведныя па сэнсе радкі і аформіць адказ, яно аказалася для вучняў складаным.

| Дзеянні герояў твора | Героі твора | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Загадчык | Сын загадчыка | Галоўны герой | Сыны галоўнага героя |
| Угаворвае не чапаць сакалянят | | | | |
| Прапануе ўтапіць птушанят | | | | |
| Лічыць жаласлівасць непатрэбнай | | | | |
| Кормяць птушанят і адносяць у лес | | | | |

*Прыклад 2*

**Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Лён — дзіва-кветка»**

***Заданне.*** Чаму царскі лён называлі тканінай-«паветрам»?

☐ Яна была цёплая, пухнатая, як воблака;
☐ з яе выраблялі ветразі, у іх дзьмула паветра;
☐ тканіна была лёгкая, празрыстая;
☐ ёю бінтавалі раны, праз яе добра паступаў кісларод.

Пасля чытання вучням неабходна было знайсці апісанне тканіны ў адным з абзацаў тэксту: *«…выраблялі рэдкую тканіну-“паветра” — царскі лён. Нітка гэтай матэрыі такая тонкая, што яе можна ўбачыць хіба што пад мікраскопам. Да нас не дайшоў сакрэт атрымання найтанчэйшай кудзелі, але ў музеях свету захаваліся рэчы з царскага льну, лёгкага, як паветра, але трывалага, як любы льняны выраб».*

Ключавое слова «паветра» і блізкія да яго паводле семантыкі словы «кісларод» і «воблака» былі закладзены ў няправільныя варыянты адказу, што выключала механічнае рашэнне задання. Для выбару правільнага адказу вучням трэба было падчас перачытвання тэксту знайсці патрэбны фрагмент, атаясаміць тканіну-«паветра» з царскам льном, затым выключыць неадпаведныя па сэнсе адказы і знайсці дакладны. Гэта заданне патрабавала ад чацвёртакласнікаў добрай арыентацыі ў тэксце, умення знаходзіць істотныя дэталі і абстрагавацца ад падобных па семантыцы адзінак.

***Заданне.*** Якія вырабы даўней рабілі са льну? Падпішыце вырабы, якія паказаны на фотаздымках.

| | |
|---|---|
| 1)  | 2)  |

| | |
|---|---|
| 3)  | 4)  |

Заданне прадугледжвала знаходжанне фрагменту тэксту: *«Льняную тканіну пачалі вырабляць больш за пяць тысяч гадоў таму. Даўней лён выкарыстоўвалі паўсюдна: з яго рабілі ветразі, палаткі, мяшкі, посцілкі, рыбалоўныя сеткі, канаты, ткалі абрусы, ручнікі. З больш тонкага палатна шылі вопратку, ніжнюю і пасцельную бялізну, фіранкі»,* а потым пошук ў ім лексічных адзінак, значэнне якіх адпавядала б фотаздымкам.

Для якаснага выканання задання трэба было высветліць значэнні ўсіх слоў у першым *(ветразі, палаткі, мяшкі, посцілкі, рыбалоўныя сеткі, канаты, ткалі абрусы, ручнікі)* і другім *(вопратка, ніжняя і пасцельная бялізна, фіранкі)* сказах і вылучыць патрэбныя. Цяжкасці ў вучняў выклікала вылучэнне запатрабаваных адзінак і неабходнасць пошуку адпаведных прадметаў, якімі сучасныя дзеці не карыстаюцца штодзённа *(канат, ветразь).*

## Уменне інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю

Да гэтай групы чытацкіх уменняў адносяцца наступныя: уменні разумець фактагічную інфармацыю (сюжэт, паслядоўнасць падзей, этапы), сэнсавую структуру тэксту (тэму, галоўную думку, ідэю), значэнне слова або выразу на аснове кантэксту; усталёўваць сувязі паміж падзеямі або тэзісамі (прычына — вынік, аргумент — контраргумент, тэзіс — прыклад, падабенства — адрозненне); суадносіць графічную і вербальную інфармацыю; рабіць высновы на аснове параўнання даных; рабіць высновы і абагульненні на аснове

інфармацыі, прадстаўленай у адным фрагменце тэксту; рабіць высновы на аснове інтэграцыі інфармацыі з розных частак тэксту або розных тэкстаў.

Інтэрпрэтацыя заданняў мела на ўвазе знаходжанне ў тэксце інфармацыі, якая патрабуе паралельных і паслядоўных інтэлектуальных дзеянняў. Вучням неабходна было зразумець паведамленне і асэнсаваць падтэкст; падчас інтэрпрэтацыі, інтэграцыі (звязвання) і абагульнення ідэй тэксту засяродзіць увагу на фрагментах, звязваючы дэталі з галоўнай думкай. (Больш просты варыянт гэтага працэсу — калі ўстанаўліваюцца сувязі паміж сумежнымі фрагментамі, больш складаны — калі між аддаленымі адзін ад аднаго фрагментамі або фрагментамі розных тэкстаў.)

Асаблівай уважлівасці і заглыблення ў сэнсы патрабавала суаднясенне візуальнай і вербальнай інфармацыі.

Прывядзём прыклады заданняў, якія выклікалі цяжкасці ў вучняў, і прааналізуем іх магчымыя прычыны.

*Прыклад 3*

**Мастацкі тэкст «Сакаляняты»**

***Заданне.*** Які загаловак падышоў бы да тэксту?

☐ «Абарона птушанят».
☐ «Сокал — шкоднік палёў».
☐ «Непатрэбная жаласлівасць».
☐ «Карысць ястрабаў».

Заданне патрабавала выканання аперацый абагульнення і абстрагавання ад неістотных дэталяў, апісаных у творы, затым — вызначэння ідэі тэксту, якая звычайна факусіруецца ў назве. Прапанаваная нейтральная назва «Сакаляняты» не магла даць падказку. Цяжкасць у выбары варыянту загалоўка ў тым, што ўсе яны звязаны з матэрыялам асноўнага тэксту, раскрываюць яго, але толькі адзін з іх («Абарона птушанят») увасабляе галоўную думку.

Аналагічнае заданне было распрацавана і паводле твора «Таямнічая прапажа», дзе неабходна было ўспрыняць тэкст цалкам, зразумець сюжэт і зрабіць выснову: «Ніхто не хацеў красці камізэльку, гэта адбылося ненаўмысна». Гэта выснова не прапісана ў асноўным тэксце і не прачытваецца ў назве. Адказ на пытанне: «Чаму прапала камізэлька?» — патрабаваў самастойных разважанняў вучняў, што ўскладніла задачу.

***Заданне.*** Чаму прапала камізэлька? Выберыце варыянт, які лічыце правільным:

☐ дзяўчаткі хацелі пажартаваць з хлопчыкаў і схавалі камізэльку;
☐ муха хацела правучыць Сяргейку і аддала камізэльку Ганулі;
☐ Міколка ўзяў камізэльку, бо ён хацеў пасмяяцца з Сяргейкі;
☐ ніхто не хацеў красці камізэльку, гэта адбылося ненаўмысна.

Разгледзім заданне на дакладнае разуменне зместу.

***Заданне***. Праз колькі дзён пасля таго, як камізэлька трапіла да Ганкі, знайшлася Сяргейкава вопратка?

☐ 4; ☐ 24;
☐ 14; ☐ 34.

Заданне тычылася ўрыўка, дзе апісваецца ча́савы адрэзак: *«Цягам двух тыдняў камізэлька не знайшлася. Усе паціху забыліся на яе»*. Па-першае, было важна, каб вучань зразумеў змест пытання: колькі дзён камізэлька захоўвалася ў Ганкі? Па-другое, трэба было знайсці канкрэтныя сказы. Па-трэцяе, неабходна было перафарматаваць вербальную канструкцыю ў лікавую (два тыдні = 14 дзён), выкарыстаўшы фонавыя веды.

*Прыклад 4*

**Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Андатра — беларуская амерыканка»**

***Заданне.*** На якім малюнку схематычна паказана хатка андатры?

1) ☐



2) ☐




3) ☐



4) ☐



Пры выкананні задання вучням неабходна было звярнуцца да наступнага фрагменту тэксту: *«Наперадзе я ўбачыў хатку андатры. Хатка ўзвышалася над вадою метра на паўтара. З выгляду гэта быў невялікі круглы стажок, складзены з галінак лазы, карнявішчаў гарлачыкаў, сцяблін трысця, чароту, асакі і рагозу. Андатра хаваецца са сваім сямействам ад вятроў, снегу, сцюжы ў цёплым гняздзе, якое знаходзіцца ўнутры над узроўнем вады. У «падлозе» хаткі зроблены выхады ў ваду».*

Праблема для чацвёртакласнікаў паўстала ў тым, каб суаднесці апісанне, дадзенае ў тэксце, са схематычным адлюстраваннем хаткі грызуна ў разрэзе, адначасова ўлічваючы некалькі яе істотных прыкмет: «круглы стажок», «гняздо, якое знаходзіцца над узроўнем вады», «у “падлозе” выхады ў ваду». Схематычнае апісанне хаткі андатры ад славеснага адрозніваецца толькі наяўнасцю істотных прыкмет аб’екта, таму вучням неабходна было засяродзіцца на іх, не звяртаючы ўвагі на другарадныя.

### Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Лён — дзіва-кветка»

***Заданне.*** Выберыце самую танную льняную тканіну:

☐ тонкая, шэрая, гладкая;
☐ тоўстая, белая, грубая;
☐ тонкая, белая, гладкая;
☐ тоўстая, шэрая, грубая.

Пры выкананні задання вучням неабходна было звярнуцца да наступнага фрагменту тэксту: *«Якасць тканіны залежала ад таўшчыні і гладкасці нітак, а таксама ад ступені белізні́: чым танчэй і бялей, тым даражэй».*

Выкананне задання патрабавала паслядоўнага выканання некалькіх дзеянняў: 1) зразумець, што тонкая белая тканіна самая дарагая і што кошт тканіны залежыць ад ступені гладкасці, 2) скласці ўяўленне пра дарагую тканіну — тонкая, белая, гладкая, 3) зразумець сэнс задачы — выбраць самую танную тканіну (пра якую няма звестак у тэксце), 4) інвертаваць уяўленне пра дарагую тканіну — тоўстая, шэрая, грубая, 5) зрабіць выбар сярод прапанаваных варыянтаў. Цяжкасці ў вучняў выклікаў трэці этап, бо тут трэба было ўважліва прачытаць пытанне і спланаваць пошук адказу. Пры няправільным выка-

нанні гэтага этапу ўвесь адказ аказваўся памылковы. Таксама вучням было складана абраць адказ, ідучы «ад адваротнага», дзе патрабавалася валоданне элементарнымі лагічнымі аперацыямі.

## Уменне асэнсоўваць і ацэньваць змест і форму тэксту

Да названай групы чытацкіх уменняў адносяцца наступныя: ацэньваць змест тэксту або яго элементаў (прыкладаў, ілюстрацый), форму тэксту (структуру, стыль), мэтазгоднасць выкарыстаных аўтарам прыёмаў мастацкай выразнасці; разумець камунікатыўны намер аўтара; вызначаць адрасат тэксту; разумець прызначэнне структурнай адзінкі тэксту; ацэньваць паўнату, дакладнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў адным або некалькіх фрагментах/тэкстах, аб'ектыўнасць, надзейнасць крыніцы інфармацыі; выяўляць супярэчнасці, якія змяшчаюцца ў адным або некалькіх тэкстах; выказваць і абгрунтоўваць уласны пункт гледжання на пытанне, якое абмяркоўваецца ў тэксце; устанаўліваць сувязі паміж элементамі/часткамі тэксту або тэкстаў; адрозніваць факт і меркаванне.

Прывядзём прыклады заданняў, якія выклікалі цяжкасці ў вучняў, і прааналізуем іх магчымыя прычыны.

*Прыклад 5*

**Мастацкі тэкст «Сакаляняты»**

***Заданне.*** Пранумаруйце падзеі ў тым парадку, у якім яны адбыліся ў тэксце. Парадак падзей пазначце ў пустых клетачках лічбамі ад 1 да 6:

☐ галоўны герой прыводзіць у парадак запісы;
☐ дзеці вярнулі птушанят у гняздо;
☐ шум і мітусня каля хаты галоўнага героя;
☐ доказ карыснасці сокалаў;
☐ начлег сакалянят у хаце;
☐ абмеркаванне, што рабіць з сакалянятамі.

Заданне на ўстанаўленне парадку падзей апавядальнага тэксту не новае для чацвёртакласнікаў: ім ужо прапаноўвалася ўзнавіць у тэкстах парушаны парадак. Цяжкасць пры выкананні дадзенага задання заключалася ў неабходнасці ўтрымання ў памяці адразу некалькіх фрагментаў падчас шматразовага перачытвання твора і, магчыма, самастойнага складання плана. Таксама вучням трэба было дакладна суаднесці назву фрагментаў з пэўным зместам: гэта значыць правесці аперацыю абагульнення.

Заданне такога ж тыпу было выкарыстана ў варыянце *«Таямнічая прапажа»: «Пранумаруйце падзеі ў тым парадку, у якім яны адбыліся ў тэксце. Парадак падзей пазначце ў пустых клетачках лічбамі ад 1 да 7»*.

Нягледзячы на вялікую колькасць пунктаў, яно было лягчэйшае за разгледжанае вышэй, бо ў творы выразна прасочваўся сюжэт і школьныя рэаліі, апісаныя ў ім, былі блізкія сённяшнім вучням.

*Прыклад 6*

**Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Лён — дзіва-кветка»**

Заданне па структуры і форме падачы было аналагічным заданню да мастацкага тэксту, але мела і пэўныя адрозненні.

***Заданне.*** Пранумаруйце этапы вырабу льняной тканіны ў тым парадку, у якім яны адбываюцца. Парадак працы пазначце ў пустых клетачках лічбамі ад 1 да 6:

☐ вырваць лён;
☐ рассцяліць на зямлі;
☐ спрасці лён;
☐ расчасаць валокны;
☐ абцерабіць (абтрапаць);
☐ саткаць палатно.

Для правільнага адказу вучням неабходна было звярнуцца да наступнага фрагменту тэксту: *«Увосень лён не касяць, а вырываюць з коранем, каб кожны сантыметр сцяблiны захаваўся і валакно*

*было доўгае. Затым расліны рассцілаюць на зямлі, каб яны вылежаліся, сталі прыгожага серабрыстага колеру і ад сцяблін лёгка аддзяліліся валокны. Валаконцы льну абцярэбліваюць і расчэсваюць грэбнем, пакуль яны не стануць падобныя да шоўку. Пасля прадуць ніткі, а ўжо з іх ткуць матэрыю. Дарэчы, апісаным спосабам можна зрабіць тканіну са звычайнай крапівы».*

Заданне было складаным, бо для вучняў працэс апрацоўкі льну малазнаёмы, што не давала магчымасці выкарыстаць штодзённы вопыт. Трэба было ўважліва прачытаць тэкст і ўсвядоміць яго змест. Дадатковыя праблемы стваралі адзінкі пасіўнай лексікі (спрасці, абцерабіць, абтрапаць), залішняя інфармацыя з адпаведнага фрагмента.

## Уменне выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту

Да названай групы чытацкіх уменняў адносяць наступныя: выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту для рашэння практычнай задачы без прыцягнення фонавых ведаў альбо з іх прыцягненнем; рабіць разлікі, прымаць рашэнні на практыцы; прагназаваць падзеі, працяг працэсу, вынікі эксперыменту; прапаноўваць інтэрпрэтацыю новай з'явы, якая належыць да таго ж класу з'яў, што абмяркоўваецца ў тэксце (у тым ліку з пераносам на іншую прадметную галіну); выяўляць сувязь паміж прачытаным і рэальнасцю або іншай эпохай.

Асноўная цяжкасць выканання прапанаваных заданняў заключалася ў неабходнасці выйсці за межы тэксту, прымяніць атрыманыя звесткі ў новай сітуацыі, адабраць з іх патрэбныя, пры неабходнасці перанесці ўменні з іншых галін жыццядзейнасці на працу з данымі тэксту.

Прывядзём прыклады заданняў, якія выклікалі найбольшыя цяжкасці ў вучняў, і прааналізуем іх магчымыя прычыны.

*Прыклад 7*

**Мастацкі тэкст**
**«Таямнічая прапажа»**

***Заданне.*** Як, на вашу думку, адчуваў сябе Сяргейка, калі яго маці патэлефанавала ягоным аднакласнікам, Міколку, Ігару і Паўлу, дадому?

- ☐ Ён быў шчаслівы, задаволены, радасны;
- ☐ яму было няёмка, сорамна, крыўдна;
- ☐ ён адчуваў сябе моцным, шчырым, добрым;
- ☐ хацеў абвінаваціць аднакласнікаў, даць здачы, адпомсціць.

Вучні звярталіся да ўрыўка: *«Пасля ўрокаў цётка Міра — мама Сяргея — стала тэлефанаваць бацькам Міколкі, Ігара і Паўла. Яна наракала, што ў класе крадуць школьную форму. Бацькі сур'ёзна ўспрынялі яе скаргу, сталі дапытвацца ў сыноў, хто ўзяў чужую рэч. Ніхто не прызнаўся, але ўсім траім забаранілі сядзець у тэлефоне і карыстацца камп'ютарам».* Складанасць, па-першае, заключалася менавіта ў эмацыянальным накале фрагмента, бо хлопчыкі па сюжэце былі невінаватыя. У такім выпадку «адфільтраваць» інфармацыю для адказу на пытанне было нялёгка. Па-другое, у тэксце не прыводзіліся звесткі пра эмоцыі і пачуцці Сяргейкі, і ад вучняў патрабавалася распазнаць іх і спрагназаваць перажыванні героя твора, абапіраючыся на ўласны вопыт.

Наступнае заданне да таго ж тэксту было нацэлена на практычнае прымяненне ведаў.

***Заданне.*** Чаму камізэлькі вучняў так лёгка было зблытаць? Напішыце. ______
______________________________________.

Прамога адказу на пытанне ў тэксце не даецца, толькі ўпамінаецца сітуацыя, не звязаная са зместам пытання: *«Пасля ўрокаў цётка Міра — мама Сяргея — стала тэлефанаваць бацькам Міколкі, Ігара і Паўла. Яна наракала, што ў класе крадуць школьную форму».*

Гэта заданне выклікала цяжкасці, бо вучням неабходна было ўважліва прачытаць тэкст, заўважыць дэталі (камізэлька — элемент школьнай формы), потым прымяніць наяўныя веды пра тое, што школьная форма ў чацвёртакласнікаў аднолькавая, і толькі затым прыняць рашэнне і самастойна сфармуляваць адказ.

*Прыклад 8*

**Прыродазнаўчанавуковы тэкст «Андатра — беларуская амерыканка»**

***Заданне.*** Звычайны чалавек можа затрымаць дыханне на адну хвіліну. У колькі разоў даўжэй пратрымаецца без кіслароду андатра? Напішыце: ____________________ ____________________________________.

Заданне скіроўвала вучняў да наступнага фрагменту: *«Зімою андатры плаваюць пад лёдам і здабываюць корм з дна возера. Дарослыя звяркі могуць абыходзіцца без паветра пятнаццаць хвілін. Яны ўмеюць грызці і зразаць зубамі сцёблы раслін пад вадою. Вусны ў андатры пад вадой сціснуты. Вострыя пярэднія зубы-разцы настолькі высунуты наперад, што яна можа кусаць імі з закрытым ротам».*

Разлікі пры выкананні задання не маглі выклікаць цяжкасцяў (15:1), але чацвёртакласнікам складана было знайсці адпаведныя лікавыя звесткі, прадстаўленыя ў вербальным выглядзе, узяць інфармацыю з фармулёўкі пытання (1 хвіліна), з тэксту (15 хвілін). Гэта заданне правярала ўважлівасць і ўдумлівасць чытання, уменне суадносіць факты з тэксту твора і тэксту пытання. Задачы на міжтэкставыя сувязі часта становяцца праблемай для вучняў першай ступені навучання.

***Заданне.*** Чаму андатра здабывае водныя расліны, не адкрываючы рота? Таму што…

- ☐ ёй замінаюць вялікія зубы;
- ☐ інакш яна захлынулася б пад вадой;
- ☐ калі яна нырае, то дыхае праз нос;
- ☐ балотныя расліны горкія на смак.

Прамы адказ на пытанне не ўтрымліваўся ў тэксце, але ў ім была згадка пра тое, што звярок не адкрывае рот пад вадой, калі перагрызае сцяблiны. Складанасць у рашэнні пастаўленай задачы заключалася ў тым, што вучні павінны былі праверыць кожную з прапанаваных гіпотэз і зрабіць вывад на аснове ўласнага вопыту і прачытанага тэксту: 1) ці замінаюць андатры вялікія зубы? — не, яны моцна высунуты наперад і дазваляюць трымаць рот закрытым; 2) калі б рот быў адкрыты, андатра захлынулася б пад вадой? — так, калі адкрыць рот на глыбіні, туды трапіць вада; 3) калі звярок нырае, то можа дыхаць праз нос? — не, андатра цалкам знаходзіцца пад вадой і можа захлынуцца, калі ўдыхне; 4) ці закрывае андатра рот, каб не пачуць горкага смаку раслін? — не, андатры харчуюцца воднымі раслінамі, якія здабываюць.

## ФАКТАРЫ, ЯКІЯ ЎПЛЫВАЮЦЬ НА СФАРМІРАВАНАСЦЬ ЧЫТАЦКАЙ АДУКАВАНАСЦІ Ў ВУЧНЯЎ

З мэтай вывучэння фактараў, якія ўплываюць на сфарміраванасць чытацкай адукаванасці вучняў, праводзілася анкетаванне вучняў, іх законных прадстаўнікоў і педагогаў. У анкетаванні прынялі ўдзел 819 педагогаў, 5 162 вучні і аналагічная колькасць іх законных прадстаўнікоў.

### Стаўленне вучняў да чытання

Для ўстанаўлення ўплыву на фарміраванне чытацкай адукаванасці такога фактару, як стаўленне вучняў да чытання, былі прааналізаваны ацэначныя меркаванні чацвёртакласнікаў.

Разгледзім уплыў такіх фактараў, як *чытанне па прымусу і чытанне дзеля задавальнення,* на ўзровень чытацкай адукаванасці на прыкладзе прыродазнаўчанавуковага тэксту.

Са сцвярджэннем: «Я чытаю толькі тады, калі я павінен гэта рабіць» — пагадзіліся 33,0 % вучняў з высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў, не пагадзіліся — 67,0 %. У вучняў з нізкім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў паказчык такі: 59,0 % з іх чытаюць пад прымусам і 41,0 % — па ўласным жаданні.

На пытанне: «Як часта пасля школы вы чытаеце для радасці і задавальнення?»* — быў атрыманы адказ «часта» ад 56,8 % вучняў з высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў і 32,7 % — з нізкім.

Відавочна, што навучанне чытанню не толькі як інструменту здабывання інфармацыі, але і як форме атрымання эстэтычнага, маральнага задавальнення звязана з паспяховым фарміраваннем чытацкай адукаванасці вучняў.

Падчас даследавання была ўстаноўлена сувязь узроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў чацвёртакласнікаў з ***актыўным удзелам бацькоў у выхаванні цікавасці і любові да чытання, фарміраванні чытацкіх густаў***. У групе вучняў з высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў «абсалютна згодны» са сцвярджэннем: «Мае бацькі цікавяцца тым, што я чытаю» — 67,4 % рэспандэнтаў, а ў групе вучняў з нізкім — толькі 45,5 %.

Важным фактарам, які ўплывае на якасць чытання, з'яўляецца ***прагаворванне, абмеркаванне прачытанага разам з дарослымі***. На пытанне: «Як часта пасля школы вы абмяркоўваеце дома тое, што чытаеце?» — вучні з высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў адказалі «часта» — 53,0 %, «ніколі» — 6,3 %, у той час як вучні з нізкім узроўнем робяць гэта «часта» — 41,8 %, «ніколі» — 10,9 %. Відавочна, што звычка абмяркоўваць прачытанае больш уласціва вучням, якія паказваюць высокі ўзровень сфарміраванасці чытацкіх уменняў.

Статыстычна значнымі сталі вынікі, атрыманыя пасля аналізу адказу на пытанне: «Як часта вы пасля чытання падручніка на ўроку каротка расказваеце аб прачытаным?».

На яго 60,6 % вучняў ад агульнай колькасці адказалі «часта». Доля вучняў з высокім і сярэднім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў тут склала 93,0 %. Адказы вучняў з нізкім і здавальняючым узроўнем далі ў суме 7,0 %.

3,6 % вучняў ад агульнай колькасці адказалі «ніколі». Сярод іх доля вучняў з нізкім і здавальняючым узроўнем склала 14,3 %.

## Роля сям'і ў развіцці чытацкай адукаванасці ў вучняў

Звернемся да вынікаў анкетавання законных прадстаўнікоў вучняў. У якасці асноўных параметраў, звязаных з уплывам сям'і на развіццё чытацкай адукаванасці, былі вылучаны наступныя:

- заняткі і гульні ў сям'і як падрыхтоўка да навучання чытанню;
- навучанне чытанню з дапамогай камп'ютара;
- узровень адукацыі бацькоў.

### Заняткі і гульні як падрыхтоўка да навучання чытанню

Прааналізуем адказы бацькоў і іншых законных прадстаўнікоў на пытанне: «Як часта да таго, як ваша дзіця пайшло ў школу, вы ці хто-небудзь з членаў сям'і чыталі дзіцяці кнігі?».

«Часта» чыталі дзецям кнігі ў сям'і ў сярэднім 67,3 % бацькоў. Унутры катэгорыі «часта» адказы размяркаваліся наступным чынам: дзеці з высокім узроў-

* Тут і далей на аналагічныя пытанні былі прапанаваны варыянты адказу: «часта», «час ад часу», «ніколі».

нем сфарміраванасці чытацкіх уменняў у гэтых сем'ях склалі 35,3 %, з сярэднім — 57,5 %, з нізкім і здавальняючым — 7,2 %.

У сярэднім 1,1 % сем'яў не чыталі дзецям кнігі «ніколі ці амаль ніколі». Унутры гэтай катэгорыі доля вучняў з высокім узроўнем склала 14,0 %, з сярэднім — 76,0 %, з нізкім і здавальняючым — 10,0 %.

Падобная тэндэнцыя назіраецца і ў адказах бацькоў на пытанне: «Як часта да таго, як ваша дзіця пайшло ў школу, вы ці хто-небудзь з членаў сям'і расказвалі яму гісторыі?».

Відавочна, што на фарміраванне высокага ўзроўню чытацкай адукаванасці вучняў істотны ўплыў аказвае заахвочванне іх да слухання, расказвання, чытання з боку законных прадстаўнікоў навучэнцаў.

У блок пытанняў пра камунікацыю ў сям'і ўвайшлі наступныя: «Як часта да таго, як ваша дзіця пайшло ў школу, вы ці хто-небудзь з членаў сям'і абмяркоўвалі тое, што разам з ім зрабілі?», «…разам прачыталі?», «…што ён/яна чытае самастойна?». Адказы на гэтыя пытанні далі суадносныя вынікі. Карысць абмеркавання і прагаворвання жыццёвых сітуацый для будучага развіцця навыкаў чытання пацвяджаецца наступнымі данымі: 97,6 % усіх вучняў «часта» або «час ад часу» абмяркоўвалі з бацькамі сумесную дзейнасць. Сярод іх каля трэці прадэманстравалі высокі ўзровень чытацкай адукаванасці, каля дзвюх трэціх — сярэдні.

На пытанне: «Як часта да таго, як ваша дзіця пайшло ў школу, вы ці хто-небудзь з членаў сям'і гулялі з ім у цацкі з алфавітам?» — «часта» і «час ад часу» адказалі 95,6 % бацькоў усіх вучняў. Унутры катэгорыі «часта» доля бацькоў вучняў з высокім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў склала 34,5 %, з сярэднім — 58,5 %, з нізкім і здавальняючым — 7,0 %. Відавочна, што знаёмства з літарамі, іх элементамі ў гульнявой форме спрыяе фарміраванню ў дашкольнікаў станоўчых адносін да працэсу навучання чытанню, памяншае няўпэўненасць, напружанасць падчас вучобы.

### Навучанне чытанню з дапамогай камп'ютара

Вынікі аналізу адказаў законных прадстаўнікоў на пытанне: «Як часта да таго, як ваша дзіця пайшло ў школу, вы ці хто-небудзь з членаў сям'і вучылі яго чытаць, выкарыстоўваючы камп'ютар?» — паказалі наступнае: «часта» выкарыстоўвалі камп'ютар для навучання чытанню 16,8 % бацькоў усіх вучняў, «час ад часу» — 35,0 %, «ніколі ці амаль ніколі» — 48,2 %. Пры гэтым «часта» выкарыстоўвалі камп'ютар бацькі толькі 17,0 % вучняў з высокім узроўнем чытацкай адукаванасці і бацькі 25,7 % вучняў, узровень якіх нізкі. Такім чынам, даныя паказваюць, што лепшы вынік для фарміравання чытацкай адукаванасці дае навучанне чытанню традыцыйным спосабам — без выкарыстання камп'ютара.

### Узровень адукацыі бацькоў

Не пацвердзілася гіпотэза, што адукацыя бацькоў мае вырашальны ўплыў на любоў да чытання, фарміраванне чытацкіх кампетэнцый дзіцяці. Сярод вучняў, чые бацькі маюць адукацыю X (XI) класаў, найменшы працэнт вучняў з нізкім і здавальняючым узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў.

## Арганізацыя навучання чытанню ва ўстановах адукацыі

Сярод асноўных паказчыкаў, звязаных з уплывам арганізацыі навучання чытанню ва ўстанове адукацыі на развіццё чытацкай адукаванасці, былі вылучаны наступныя:
- педагагічны стаж настаўніка;
- формы работы з вучнямі на ўроку;
- выкананне вучнямі пісьмовых работ;
- работа над вылучэннем ідэі тэксту;
- рэгулярнасць самаадукацыі настаўніка.

З мэтай выяўлення карэляцыі паміж ***педагагічным стажам настаўніка*** і паказчыкамі сфарміраванасці чытацкай адукаванасці вучняў былі прааналізаваны атрыманыя ў ходзе анкетавання адказы педагогаў. Доля вучняў з высокім узроўнем чытацкай адукаванасці ў класах, дзе стаж настаўніка перавышае 20 гадоў, складае 31,0 %; у класах, дзе працуюць настаўнікі са стажам ад 16 да 20 гадоў, такіх вучняў у сярэднім 11,8 %. Пры гэтым працэнт вучняў з сярэднім узроўнем чытацкай адукаванасці застаецца стабільна высокім (да 78,7 %, без сувязі са стажам настаўніка).

Для ўстанаўлення ***ўплыву форм працы з вучнямі*** на ўзровень сфарміраванасці іх чытацкай адукаванасці настаўнікам было зададзена пытанне: «Як часта на вучэбных занятках у працэсе работы над тэкстам вы працуеце з групамі вучняў з рознымі здольнасцямі?». Даныя анкетавання паказалі, што па катэгорыях «заўжды», «часта» і «час ад часу» разбежка ў долі вучняў высокага ўзроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў складае ад 25,0 % да 36,0 %, сярэдняга — ад 56,0 % да 64,0 %. Пры гэтым доля вучняў з высокім узроўнем, з якімі настаўнікі «ніколі» не працуюць у названых групах, вагаецца паміж паказчыкамі 88,9 % (мастацкі тэкст), 96,2 % (прыродазнаўчанавуковы тэкст), што сведчыць пра высокую матываванасць моцных вучняў і іх уменне працаваць індывідуальна.

Для аналізу такога фактару, як суадноснасць ***выканання пісьмовых работ*** з узроўнем сфарміраванасці ў чацвёртакласнікаў навыкаў чытання, педагогам было зададзена пытанне: «Ці часта пасля таго, як вучні прачытаюць зададзены тэкст, вы просіце іх выканаць пісьмовую работу па прачытаным тэксце?». Пры адказе «ніколі ці амаль ніколі» доля вучняў, якія маюць высокі і сярэдні ўзроўні сфарміраванасці навыкаў чытання, склала адпаведна 25,8 % і 71,0 %. У астатніх выпадках (адказы «на кожным уроку», «часта» і «час ад часу») размеркаванне вучняў амаль не адрозніваецца: каля 60 % на сярэднім узроўні і каля 30 % — на высокім.

Падобным чынам размеркаваліся даныя і пры адказах на пытанні: «Як часта вы просіце вучняў параўнаць тое, што прачыталі, з прачытаным раней?», «Як часта вы просіце вучняў параўнаць тое, што прачыталі вучні, з іх жыццёвым вопытам?», «Як часта пры ацэнцы навучальных дасягненняў вучняў вы выкарыстоўваеце заданні з выбарам адказу па прачытаным матэрыяле?».

Для фарміравання чытацкіх уменняў выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту крытычна важна навучыць чацвёртакласнікаў ***вылучаць ідэю тэксту.*** Пры адказе на пытанне: «Як часта вы просіце вучняў вылучыць асноўныя ідэі ў прачытаным тэксце?» — найбольшы працэнт вучняў з высокім і сярэднім узроўнем сфарміраванасці чытацкіх навыкаў у катэгорыі «час ад часу» — 96,3 % (пры рабоце з мастацкім тэкстам) і 90,5 % (з прыродазнаўчанавуковым тэкстам).

Паказальныя вынікі анкетавання, дзе прасочваецца сувязь паміж ***рэгулярнасцю самаадукацыі настаўнікаў*** і ўзроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў вучняў. Разгледзім гэта на прыкладзе вучняў з нізкім і здавальняючым узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў. Калі настаўнік чытае для самаадукацыі «раз на тыдзень і часцей», то працэнт такіх вучняў складае толькі 6,4 %, калі ж «1—2 разы на год» — амаль удвая большы (12,0 %).

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА РАЗВІЦЦІ ЧЫТАЦКАЙ АДУКАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

***Вучэбна-метадычным кабінетам, метадычным аб'яднанням настаўнікаў пачатковых класаў рэкамендуецца:***

- прааналізаваць вынікі вывучэння чытацкай адукаванасці вучняў IV класаў;

- правесці навучальныя семінары для кіраўнікоў метадычных аб'яднанняў настаўнікаў, якія працуюць на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, па ацэнцы сфарміраванасці чытацкай адукаванасці вучняў;
- разгледзіць эфектыўныя методыкі фарміравання навыкаў чытання і разумення тэксту на беларускай мове з улікам айчыннага і замежнага вопыту;
- распаўсюдзіць паспяховы вопыт фарміравання чытацкай адукаванасці вучняў у педагагічных калектывах.

***Адміністрацыі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі рэкамендуецца:***

- азнаёміцца з вынікамі маніторынгу чытання і разумення тэксту вучням IV класаў і адпаведнымі рэкамендацыямі;
- забяспечыць абмеркаванне вынікаў маніторынгу ў настаўніцкай аўдыторыі ўстановы адукацыі;
- арганізаваць пасяджэнні метадычных аб'яднанняў з мэтай рэалізацыі рэкамендацый па развіцці чытацкай адукаванасці і пераадоленні хібаў у падрыхтоўцы вучняў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- арганізаваць павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў пачатковых класаў па тэме функцыянальнай (чытацкай) адукаванасці вучняў;
- азнаёміць з рэкамендацыямі па развіцці чытацкай адукаванасці законных прадстаўнікоў вучняў праз «Бацькоўскі ўніверсітэт»;
- даручыць бібліятэцы ўстановы адукацыі арганізаваць мерапрыемствы па папулярызацыі чытання сярод вучняў, якія навучаюцца на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- у супрацоўніцтве з бібліятэкай установы адукацыі правесці выставу і абмеркаванне выданняў і публікацый для педагогаў па развіцці чытацкай адукаванасці вучняў пачатковых класаў.

***Педагагічным работнікам I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэкамендуецца:***

- актуалізаваць уласныя веды пра групы чытацкіх уменняў і арганізаваць сістэмную работу па іх фарміраванні ў вучняў на ўроках па розных вучэбных прадметах;
- засяродзіць увагу на практыкаваннях па фарміраванні ўменняў і навыкаў чытання і разумення тэкстаў;
- надаваць увагу тэхнічным характарыстыкам чытання: уменню дачытваць тэкст да канца і перачытваць яго; арыентавацца ў ім, улічваць час чытання тэксту, складаць план;
- арганізаваць знаёмства вучняў з беларускамоўнымі тэкстамі для самастойнага чытання і абмеркавання ў адпаведнасці з узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі з мэтай матывацыі да чытання для радасці і задавальнення (напрыклад, арганізаваць кніжны клуб);
- унесці ў план самаадукацыі пытанні фарміравання чытацкіх кампетэнцый вучняў;
- дыферэнцыраваць пытанні і заданні для вучняў паводле ўзроўняў сфарміраванасці ў іх чытацкіх уменняў:

**а)** вучням з ***нізкім і здавальняючым*** узроўнем часцей за іншых прапаноўваць заданні на выпрацоўку уменняў:

I група чытацкіх уменняў

- вызначаць месца, дзе ўтрымліваецца інфармацыя, якая падлягае пошуку *(знайдзіце ў тэксце/загалоўку/малюнку/подпісе/схеме/зносцы/табліцы…; адкажыце, у якой частцы тэксту знаходзіцца інфармацыя пра…; падлічыце, колькі разоў аўтар гаворыць аб…; назавіце, пра што аўтар піша ў пачатку/канцы тэксту)*;
- знаходзіць і здабываць адну адзінку інфармацыі, размешчаную ў адным фрагменце тэксту *(раскажыце, што сказана ў гэтай частцы твора пра…; адкажыце, якімі словамі перадаецца інфармацыя аб…)*;

- вызначаць наяўнасць або адсутнасць пэўнай інфармацыі ў канкрэтным тэксце *(дакажыце, што інфармацыя пра… ёсць у тэксце; выберыце, якія факты ўзяты з тэксту; знайдзіце, што лішняе/чаго не хапае ў пераказе тэксту/эпізода)*;

II група чытацкіх уменняў

- разумець сэнс тэксту *(раскажыце, пра каго/што гэты тэкст, якая яго тэма; адкажыце, што вы зразумелі, калі прачыталі тэкст/абзац/сказ, і што зразумеў герой твора, што новага заўважылі, калі перачытвалі тэкст двойчы, тройчы; растлумачце назву твора)*; фактaлагічную інфармацыю *(пералічыце, пра што вы даведаліся з тэксту; прывядзіце прыклады тых з'яў, пра якія гаворыцца; назавіце герояў тэксту; раскажыце, у якім парадку адбываліся падзеі/выкладзены думкі)*; значэнне слова або выразу *(знайдзіце ў слоўніку…; растлумачце аднакласнікам, што азначаюць выразы…; перадайце іншымі словамі…)*;
- усталёўваць сувязі паміж падзеямі або тэзісамі *(адкажыце, з якой прычыны…, навошта…, з якім вынікам; вызначце падабенства і адрозненне паміж двума…; адрозніце важныя і няважныя дэталі/факты/учынкі/паводзіны/рысы характару; пакажыце, да якога правіла гэты прыклад, або прывядзіце прыклады)*;
- рабіць высновы і абагульненні на аснове інфармацыі, прадстаўленай у адным фрагменце тэксту *(адкажыце, ці можна аднесці характарыстыку… да ўсіх герояў твора, чаму вучыць сітуацыя/герой/тэкст…; назавіце станоўчых і адмоўных персанажаў; раскажыце, які вывад вы зрабілі, прачытаўшы твор, які вывад зрабіў герой твора)*;
- суадносіць графічную і вербальную інфармацыю *(апішыце малюнак словамі тэксту, параўнайце апісанне і подпіс пад малюнкам; аформіце подпіс пад малюнкам/фотаздымкам; раскажыце паводле схемы/табліцы…; падбярыце ілюстрацыю; намалюйце паводле тэксту…; пазнайце, які фрагмент тэксту паказаны на выяве)*;

III група чытацкіх уменняў

- вылучаць структурныя адзінкі тэксту *(пакажыце загаловак, подпіс, ілюстрацыі, зноскі, часткі, абзацы; адрозніце словы/думкі аўтара і словы/думкі героя; пакажыце, з якіх частак складаецца тэкст; знайдзіце ў казцы зачын і канцоўку)*;
- ацэньваць форму тэксту *(адкажыце, што вы прачыталі — апавяданне, разважанне або апісанне, у вершаванай або празаічнай форме, ці знаёмыя вам творы такога віду (апавяданне, казка, песня, верш); вызначце, якія сказы/радкі выкарыстоўвае аўтар — кароткія або доўгія; раскажыце, у якім парадку адбываліся падзеі і ў якім пра гэта расказаў аўтар)*; змест тэксту або яго элементаў *(знайдзіце, якімі словамі аўтар перадае/называе…, якія прыклады прыводзіць аўтар і якія думкі яны пацвярджаюць; падумайце, чаму выкарыстаны менавіта гэтыя ілюстрацыі да тэксту; замяніце словы аўтара на іншыя падобныя, прасачыце, ці захаваўся настрой, сэнс)*;
- вызначаць адрасата тэксту *(падумайце, для каго напісаны твор, каму ён можа быць цікавы)*;

IV група чытацкіх уменняў

- выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту для рашэння практычнай задачы без прыцягнення фонавых ведаў *(падумайце, як бы вы адказалі на пытанне, зададзенае ў тэксце, як сёння рашаецца праблема, паказаная ў тэксце; адкажыце, як прымалі рашэнне героі твора, парайце, як ім трэба было паступіць)*;
- прагназаваць падзеі *(прыдумайце працяг апавядання, увядзіце яшчэ аднаго*

*прыдуманага вамі героя ў прачытаны твор, раскажыце пра яго; паразважайце, як бы паступіў герой у іншых абставінах…, як бы паступілі вы ў падобнай сітуацыі)*;

- выяўляць сувязь паміж прачытаным і рэальным жыццём *(скажыце, у якой сітуацыі сёння можна выкарыстаць вывады, зробленыя вамі па тэксце; параўнайце, чым падобныя падзеі тэксту і нашага штодзённага жыцця)*.

**б)** вучням з ***высокім і сярэднім*** узроўнем сфарміраванасці чытацкіх уменняў прапаноўваць заданні па прынцыпе паступовага павелічэння складанасці:

I група чытацкіх уменняў

- знаходзіць і здабываць некалькі адзінак інфармацыі, размешчаных у розных фрагментах тэксту або ў некалькіх тэкстах *(выберыце, якая ідэя сцвярджаецца ў абодвух тэкстах; пакажыце, якой інфармацыі няма ні ў адным з тэкстаў; знайдзіце тэкст, дзе прадстаўлена больш фактаў)*;

II група чытацкіх уменняў

- разумець сэнсавую структуру тэксту *(назавіце тэму твора; скажыце, якая галоўная думка тэксту; растлумачце, што хацеў сказаць аўтар чытачу праз гэты твор, дзеля чаго напісаў яго; вылучыце асноўную думку ў кожнай частцы тэксту)*; значэнне слова або выразу на аснове кантэксту *(падумайце, што азначае слова/выраз, не зазіраючы ў слоўнік; прапануйце некалькі магчымых варыянтаў значэння незнаёмага слова; прывядзіце прыклад сітуацый, калі ўжываецца выраз…)*;
- усталёўваць сувязі паміж падзеямі або тэзісамі *(прывядзіце прыклады; растлумачце прычыны/мэту ўчынку…; намалюйце схему, як героі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой; перадайце сюжэт з дапамогай шэрагу геаметрычных фігур)*;
- рабіць высновы на аснове параўнання даных *(параўнайце схему і тэкст, табліцу і малюнак, твор і ілюстрацыю, скульптуру і песню паводле твора; запоўніце параўнальную табліцу; складзіце табліцу; вылучыце пяць агульных рыс, пяць адрозных рыс паміж…)*;
- інтэграцыі інфармацыі з розных частак тэксту або розных тэкстаў *(зрабіце выснову паводле прыкладаў з тэксту; знайдзіце ў пераліку лішняе (героя, апісанне, факт); адкажыце, у якіх творах вы сустракалі падобных герояў, каго нагадваюць вам гэтыя персанажы; прасачыце, як выглядаў/паводзіў сябе герой у пачатку і ў канцы твора)*;

III група чытацкіх уменняў

- разумець камунікатыўны намер аўтара *(скажыце, якія пачуцці хацеў выклікаць аўтар у чытача; вызначце, якія праблемы непакояць аўтара; здагадайцеся, у якія часы быў напісаны твор, або знайдзіце прыкметы даўнейшых часоў у творы)*; прызначэнне структурнай адзінкі тэксту *(растлумачце, навошта аўтар падрабязна расказвае пра…; скажыце, чаму нельга аб'яднаць суседнія абзацы; назавіце незвычайныя словы, якія выкарыстоўвае герой у сваім маўленні, трапныя выразы, якія вы заўважылі; падумайце, чаму аўтар менавіта так скончыў апавяданне; падумайце, якімі словамі аўтар апісвае… і чаму менавіта гэтымі)*;
- ацэньваць паўнату, дакладнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў адным або некалькіх фраментах/тэкстах *(праверце па слоўніку/энцыклапедыі інфармацыю/факты з тэксту; здагадайцеся, з якой крыніцы можа быць узяты гэты тэкст; скажыце, якіх звестак не хапае ў тэксце; падумайце, хто можа пацвердзіць праўдзівасць апісаных падзей)*;
- выказваць і абгрунтоўваць уласны пункт гледжання на пытанне, якое абмяркоўваецца ў тэксце *(адкажыце, якое б*

*вы прынялі рашэнне на месцы героя; выкажыце меркаванне, ці згодны вы з аўтарам; скажыце, што з тэксту для вас было цікавым або новым)*;

- адрозніваць факт і меркаванне *(пакажыце, якія звесткі можна праверыць, а якія не; знайдзіце, у якім эпізодзе паказаны сапраўдныя падзеі; выкажыце ўласнае меркаванне, што вы думаеце пра сітуацыю з тэксту; параўнайце сваё меркаванне з пунктам гледжання аднакласнікаў; паслухайце меркаванне аднакласнікаў і параўнайце з інфармацыяй з падручніка/даведніка);*
- вызначаць адрасата тэксту *(падумайце, калі быў напісаны тэкст і для каго ён мог быць важны ў той час і цяпер)*;

IV група чытацкіх уменняў

- выкарыстоўваць інфармацыю з тэксту для рашэння практычнай задачы з прыцягненнем фонавых ведаў *(прывядзіце прыклады, як можна вырашыць праблему, паказаную ў тэксце, рознымі спосабамі, як вы можаце прымяніць звесткі з тэксту ў жыцці; раскажыце, чым карыснае чытанне такіх тэкстаў для вучняў вашага класа/узросту)*;
- прагназаваць падзеі, працяг працэсу *(апішыце героя, якім ён будзе праз дзесяць гадоў; прачытайце твор да сярэдзіны і скажыце, чым ён скончыцца, дачытайце і праверце сябе; прымяніце сітуацыю твора да сучаснасці і скажыце, як бы яна развівалася; падумайце, ці мог герой прыняць правільнае рашэнне, калі б не ведаў..., што было б, калі б ён паступіў па-іншаму)*;
- прапаноўваць інтэрпрэтацыю новай з'явы, якая належыць да таго ж класа з'яў, які абмяркоўваецца ў тэксце *(выкажыце меркаванне, у якіх навуковых даследаваннях можна прымяніць веды, атрыманыя з тэксту, якімі гукамі/фарбамі/фігурамі/адчуваннямі можна апісаць з'яву, паказаную ў тэксце; прывядзіце прыклад з іншых вуэбных прадметаў, звязаных з тэкстам/словам)*;
- выяўляць сувязь паміж сучаснай рэальнасцю і іншай эпохай, рэаліямі розных краін *(вызначце, якія часы апісваюцца ў тэксце; адкажыце, якія факты аб іншай краіне паказаны ў творы; пакажыце, якія сучасныя рэчы/з'явы былі вядомыя людзям раней)*.

***Бацькам навучэнцаў рэкамендуецца:***

- рэкамендаваць дзецям актуальныя кнігі для чытання, у тым ліку ў перакладзе на беларускую мову;
- чытаць дзецям уголас і абмяркоўваць прачытанае, чытаць разам з імі па ролях, ланцужком;
- абмяркоўваць штодзённыя праблемныя сітуацыі;
- цікавіцца поспехамі дзіцяці ў чытанні;
- весці альбом любімых літаратурных герояў дзіцяці;
- расказваць дзецям гісторыі, складаць разам з імі вусныя апавяданні, казкі з працягам, тэксты ў жанры фэнтэзі;
- прыкладваць намаганні па стварэнні асяродку, у якім дзеці могуць пачуць беларускую мову (тэатры, фестывалі, гурткі);
- арганізоўваць сумесны прагляд фільмаў у беларускім агучванні, слуханне беларускага радыё;
- знаёміць дзяцей з правіламі карыстання тэрытарыяльнай бібліятэкай, спосабамі выбару цікавых кніг (па рэкамендацыі, па анатацыі);
- афармляць падпіску на папулярныя беларускія дзіцячыя часопісы;
- звяртаць увагу на новыя словы падчас чытання шыльдаў, чэкаў, інструкцый, апісання прадуктаў на беларускай мове;
- сумесна з дзецьмі працаваць з даведачнымі інтэрнэт-крыніцамі на беларускай мове (слоўнікамі, энцыклапедыямі, тэматычнымі сайтамі).

*Матэрыялы падрыхтаваны спецыялістамі*
*Цэнтра ацэнкі якасці адукацыі Акадэміі адукацыі*